МИНИСТЕРСТВО ОБРАЗОВАНИЯ
РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ

УЧРЕЖДЕНИЕ ОБРАЗОВАНИЯ
«ВИТЕБСКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ
ТЕХНОЛОГИЧЕСКИЙ УНИВЕРСИТЕТ»

БИБЛИОТЕКА

# На кожнай сцяжынцы іх песня і голас

Літаратурна-музыкальная кампазіцыя да 140-годдзя з дня нараджэння Янкі Купалы і Якуба Коласа



Михайлова Ольга Михайловна
ведущий библиотекарь

ВИТЕБСК, 2022

**Мэта:** выхаванне любові да роднага краю, павагі да гістарычнага мінулага.

**Задачы:**

- узгадаць старонкі жыцця і творчасці Янкі Купалы і Якуба Коласа;
- фарміраванне маральных каштоўнасцей на прыкладзе лепшых узораў паэзіі, музыкі, песеннай творчасці;
- развіццё пачуцця патрыятызму, грамадзянскае выхаванне.

**Мэтавая аудыторыя:** студэнты 2 курса факультэту вытворчых тэхналогій.

**Форма мерапрыемства:** групавая.

**Абсталяванне і тэхнічныя сродкі:** музычная, звукавая апаратура (акустычная сістэма, ноутбук, 3 мікрафоны).

**Дэкарацыі, рэквізіт, атрыбуты:** шырма, рушнікі, бумажныя васількі, беларускія музычныя інструменты, вышыванкі, лялькі ў беларускіх народных касцюмах, рэчы з гліны, куфар ільняны, кніжная выстава "Янка Купала і Якуб Колас - прызнаныя песняры свайго народа", беларускія нацыянальныя касцюмы.

**Музычнае афармленне:**

Звук №1. "Беларуская мелодыя" І. Жыновіча

Звук №2. Песня "Мой родны кут", словы Я. Коласа, музыка І. Лучанка

Звук №3. Мелодыя песні "Спадчына", музыка І. Лучанка

Звук №4. Песня "Явар з калінаю", словы Я. Купалы, музыка Ю. Семеняка

Звук №5. Песня "Малітва", словы Я. Купалы, музыка У. Мулявіна

**Дзеючыя асобы**
Вядучы 1.
Вядучы 2.
Чытальнік.

*Файе бібліятэкі афармлена ў беларускім народным стыле. Шырма ўпрыгожана рушнікамі і васількамі. На стале экспазіцыя рэчаў беларускай культуры. Побач экспаніравана кніжная выстава.*

*Звук №1*

**Чытальнік.** Зямля Беларусі! Бары і дубровы,
Жытнёвае поле, шаўковы мурог,
У промнях рабіны заход вечаровы,
Што клёкат буслоў – ручаёў перамовы.
І ў шумных прысадах істужкі дарог.
Зямля Беларусі! Вачамі азёраў
Глядзіш ты ў празрыстыя высі нябёс,
Начамі, што яблыкі, падаюць зоры,
Знікаюць па водах, па чорных разорах,
Па травах, абсыпаных кроплямі рос…
Зямля Беларусі, зялёныя долы!
З крыніц тваіх чыстых пад шумнай вярбой
Зачэрпнулі думы Купала і Колас,
На кожнай сцяжынцы іх песня і голас
З тваёю журбой і ўцехай тваёй.

**Вядучы 1.** 7 ліпеня 1882 года ў фальварку Вязынка Мінскага павета нарадзіўся Іван Дамінікавіч Луцэвіч – будучы народны паэт Беларусі Янка Купала.

Вёска Вязынка.

Хата на ўзгорку ля гаю,

Усёй краіне вядомай ты стала.

У глухім гушчары

Беларускага краю

Тут на свет нарадзіўся Купала.

П. Прыходзька “На радзіме Купалы”

**Вядучы 2.** Свой псеўданім выдатны пясняр выбраў невыпадкова: ім паэт хацеў падкрэсліць жаданне – і жыццём і песняй служыць свайму народу, дапамагчы знайсці жаданую папараць-кветку, кветку шчасця.

**Вядучы 1.** 3 лістапада ў вёсцы Акінчыцы нарадзіўся Канстанцін Міхайлавіч Міцкевіч – будучы народны паэт Беларусі Якуб Колас.

Дзён юначых быў калыскай Нёман –

Бурная імклівая рака.

Чуў ты плач над імі шчыры гоман,

Песні селяніна, рыбака.

ваё сэрца гэта ўсё ўмясціла –

Шчырае, шырокае, як свет.

І свой край, што родным быў і мілым,

Ты з любоўю апяваў, паэт.

П. Прануза “Якубу Коласу”

*Звук №2.*

*Песню выконвае Міхайлава Вольга.*

**Вядучы 2.** Колькі б мы ні чыталі творы Купалы і Коласа, ніколі не перастанем здзіўляцца, якая бязмежная і магутная стыхія жывой народнай мовы адлюстроўваецца ў іх словах. Прыняўшы як святыню вялікі запавет Багушэвіча: “Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб не ўмерлі”, Купала і Колас да канца сваіх дзён змагаліся за развіццё і існаванне роднай мовы.

**Чытальнік.** Магутнае слова, ты, роднае слова!
Са мной ты на яве і ў сне;
Душу мне затрэсла пагудкаю новай,
Ты песень наўчыла мяне.

Бяссмертнае слова, ты, роднае слова!
Ты крыўды, няпраўды змагло;
Хоць гналі цябе, накладалі аковы,
Дый дарма: жывеш як жыло!
Свабоднае слова, ты, роднае слова!
Зайграй ты смялей, весялей!
Хоць гадзіны сыкаюць, кружацца совы,
Жывеш ты на хвалу людзей.
Загнане слова, ты, роднае слова!
Грымі ж над радзімай зямлёй:
Што родная мова, хоць бедная мова,
Мілей найбагатшай чужой!

Янка Купала. Роднае слова

**Вядучы 1.** Хвалюючыся за будучыню беларускай літаратуры, Францішак Багушэвіч на схіле 19 ст. пісаў: “Смык” ёсць, а хтось скрыпку,

можа, даробе, а там была “Дудка…” – вот мы і зробім музыку”. Гэтыя словы сталі запаветам яго паслядоўнікам. Голасна зайграла “Скрыпка…” Цёткі, следам за ёй на ўсе лады заспявала “Жалейка” Купалы, а потым паліліся “Песні жальбы” Коласа, а яшчэ ў гэтую музыку ўліліся мелодыі купалаўскага “Гусляра”.

*Звук №3*

**Вядучы 2.** І ўсе песні былі пра родны край, пра яго нядолю, пра адвечную прыгажосць яго чароўных мясцін. Усё ў іх было такое знаёмае для простага чалавека, сваё, бачанае сотні, тысячу разоў, і разам з гэтым была высокая паэзія.

**Чытальнік**. Вобразы мілыя роднага краю,
Смутак і радасць мая!
Што маё сэрца да вас парывае?
Чым так прыкованы я

К вам, мае ўзгорачкі роднага поля,
Рэчкі, курганы, лясы,
Поўныя смутку і жальбы нядолі,
Поўныя смутнай красы?

Толькі я лягу і вочы закрыю,
Бачу я вас прад сабой.
Ціха праходзіце вы, як жывыя,
Ззяючы мілай красой.

Чуецца гоман мне спелае нівы,
Ціхая жальба палёў,
Лесу высокага шум-гул шчаслівы,
Песня магутных дубоў…

Вобразы мілыя, вобразы смутныя,
Родныя вёскі і люд,
Песні цягучыя, песьні пакутныя!..
Бачу і чую вас тут.

Я. Колас “Родныя вобразы”

**Вядучы 1**. Інтымная лірыка Я. Купалы – гэта вечныя творы, бо вечныя пачуцці, якія яны ўслаўляюць: гераізм, сумленнасць, непадкупнасць і, найперш, каханне.

**Чытальнік.** Песняй вясны лебядзінаю,
Скінуўшы зімнія чары,
Шэпчуцца явар з калінаю
У сумнай даліне над ярам.
Лісцікі зеленяй хваляцца
Небу панятлівай мовай:
Росамі мыюцца раніцай,
Песцяцца сонцам паўднёвым…
Чуецца музыка дзіўная
У повесцях сонных імшараў…
Цешыцца явар з калінаю.
Скінуўшы зімнія чары.

Янка Купала “Явар з калінаю”

*Звук №4*

**Вядучы 2.** Лёс падараваў Якубу Коласу сустрэчу і каханне з адзінай жанчынай, якая на ўсё астатняе жыццё стала яго зоркай, натхненнем,

спадзяваннем і шчасцем. Марыя Дзмітрыеўна Каменская, з якой паэт пазнаёміўся і ажаніўся ў Пінску, стала самай дарагой, любімай і незабыўнай. Адзінай назаўсёды.

**Чытальнік**. Ты без мяне, а я далёка.

Над стэпам звіс нябёсаў тын,
А снег стэповы слепіць вока,
І сумна мне, бо я адзін.
За час наш доўгі я нямала
Быў у разлуцы і журбе.
Рука мая не ўсё спісала
З таго, што думаў аб табе.
Я знаю – шмат ты мела гора
І горыч дум піла да дна,
І шмат было тваіх дакораў,
Хоць ты ў душы маёй адна.
-Даруй жа мне! – скажу я толькі,
Схіліўшы нізка галаву,-
Забудзь пакуты, гора, болькі-
Табой я жыў, табой жыву.

І блізка ты, і ты далёка,

Над стэпам звіс нябёсаў тын.

Змярцвелы стэп не цешыць вока,

І сумна мне, бо я адзін.

**Вядучы 2.** Я. Колас і Я. Купала былі вельмі розныя як асобы, і як творцы: парывісты, тэмпераментны, узнёслы Янка Купала; ураўнаважаны, рэалістычны Якуб Колас. Адзін – вястун і прарок, другі – летапісец і філосаф. Нават іх паэтычныя імёны гаварылі аб рознасці іх творчай сутнасці: “Колас” – ад зямлі, ад працы, “Купала” – з летуценняў і мар аб папараці-кветцы, аб шчасці.

**Вядучы 1.** Але колькі ў іх было роднаснага і аднолькавага: як горача і самаахвярна любілі яны і пясчаную сваю зямельку, і цягавітага ды маўклівага братку-беларуса, і поўную хараства і замілавання матчыну песню, родную мову. І кожны па-свойму складаў у гонар Айчыны гімн, і з надзеяй і верай шаптаў за яе малітву.

*Звук №5*

*Песню выконвае Міхайлава Вольга.*


15 сентября
День библиотек
Республики Беларусь
Я.Купала і Я.Колас -
Янка Купала







